Чарговы прысуд за каментарый у інтэрнеце

16.02.2022



Суд Светлагорскага раёна.

14 лютага грамадзянін **Міхаіл Заранкоў** прыгавораны да 2 год абмежавання волі за публічную знявагу міліцыянта, які спыняў яго аўтамабіль у лясным масіве.

Улетку 2019 г. старшы лейтэнант міліцыі **М. С. Назаранка** ў лясным масіве каля г. Светлагорска спыніў аўтамабіль 40-гадовага **Міхаіла Алегавіча Заранкова**, пацікавіўся, ці ёсць забароненыя да абарачэння рэчывы, і, як распавёў **Міхаіл** у судзе, паводзіў сябе груба.

30 кастрычніка 2020 года **М. Заранкоў** у адным з адкрытых каналаў інтэрнет-месенджара «Тэлеграм» убачыў фатаздымак **М. Назаранкі** з указаннем, што той 9 – 10 жніўня 2020 г. удзельнічаў у разгоне мірнай акцыі. Пад гэтым фота было шмат негатыўных каментарыяў, і **М. Заранкоў** таксама размясціў каментарый. Пра гэты каментарый лейтэнант міліцыі 31 кастрычніка 2020 г. падаў заяву аб прыцягненні да адказнасці асобы, якая яго напісала, за публічную знявагу прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў.

Разгляд справы ў судзе пачаўся 8 лютага. **М. Заранкоў** віну не прызнаў. Ён патлумачыў, што размясціў каментарый пад фатаздымкам **М. Назаранкі** ў выніку непрыязненых адносін, якія склаліся пасля выпадку ў лясным масіве ў 2019 г., і не меў намеру зневажаць **М. Назаранку** як прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў. Раней **М. Заранкоў** да крымінальнай адказнасці не прыцягваўся, па месцы жыхарства і ранейшай працы мае станоўчыя характарыстыкі, мае 21 год працоўнага стажу (па прафесіі – нафтавік). У перыяд працы яго фота было на Дошцы гонару, а ў характарыстыцы, сярод іншага, адзначана што ён «у дэструктыўных паводзінах і выказваннях не заўважаны».

М. Назаранка патлумачыў, што служыць у РАУС Светлагорскага райвыканкама з 2010 г., са жніўня 2015 г. на пасадзе аперупаўнаважанага аддзялення па наркакантролю і супрацьдзеянню гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі РАУС, да верасня 2021 г. быў у званні старшага лейтэнанта міліцыі. У РАУС характарызуецца як кампетэнтны супрацоўнік,

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2021

СВАБОДА СХОДАЎ

Тры гады "хатняй хіміі" — за знаходжанне на праспекце і парушэнне працы "Мінсктранса"

Дзяржабвінавачанне запрасіла два гады калоніі для палітвязня Івана Багдзевіча

Што адбывалася ў судах па адміністрацыйных справах цягам тыдня?

Ці можна трапіць у калонію, калі своечасова не зняў бчб-сняжынкі з акна? Юрыст расказвае пра змены ў Крымінальным кодэксе

СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ

Сястра асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Паўлава: "Яго хутчэй за ўсё расстралялі"

Андрэй Палуда: "Пакуль няма сістэмных зменаў, новыя прысуды і расстрэлы могуць адбыцца ў любы момант"

Вярхоўны суд не задаволіў апеляцыйную скаргу асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Скрундзіка

Асуджаных да смерці братоў Косцевых памілавалі

адданы службоваму доўгу. Каментарый **М. Заранкова** выклікаў у яго пачуццё крыўды і прыніжэння, нанёс шкоду яго гонару і годнасці, як грамадзяніну, так і службовай асобе, якая дабрасумленна выконвае свае абавязкі на дзяржаўнай службе.

Справу разглядала суддзя **Гулевіч Галіна Мікалаеўна** з удзелам дзяржаўнага абвінаваўцы – намесніка пракурора Светлагорскага раёна **Рудніка А. Г.**, які запытаў для абвінавачанага 2 гады абмежавання волі. Было вырашана, што дзеянне, учыненае **М. Заранковым**, не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі. Прыгавор – 2 гады абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, а мабільны тэлефон, з якога быў зроблены каментарый, канфіскаваны.

Аўтар: **В. Аляксейчанка**

Гомельская вясна

ВІДЭА



БЛОГІ



ЛЕАНІД СУДАЛЕНКА

ЯК Я НЕ СТАЎ УДЗЕЛЬНІКАМ НАРОДНАГА "ХУРАЛА" ЦІ ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!



ЛАРЫСА ШЧЫРАКОВА

Як прайшла спецаперацыя ГУБАЗіК па пошуку брудных майткоў у журналісткі ці кароткая гісторыя аднага ператрусу

НАВІНЫ ПАРТНЁРАЎ

07.04.2023 Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе «Вясна»

23.03.2023 Зняў двух п'яных расейскіх вайскоўцаў – трапіў пад пераслед, але здолеў збегчы радыё «Свабода»

07.03.2023 Ксенія Луцкіна перахварэла ў калоніі на двухбаковую пнеўманію «Народная воля»

02.03.2023 У палітзняволенай журналісткі Ірыны Слаўнікавай істотна пагоршыўся зрок БАЖ

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў СВЕЦЕ


08.08.2022 Пошта ЗША спыніла адпраўленні ў Беларусь

26.07.2022 «Інфармацыя пра маё затрыманне нават мяне шакавала»: ураджэнца Гомельшчыны ўжо тры месяцы трымаюць у ІЧУ ў Расеі

23.07.2022 У Польшчы знік 18-гадовы хлопец з Калінкавічаў

14.07.2022 У Кіеве заявілі аб імавернасці ўзброеных правакацый у памежных з Украінай раёнах Гомельшчыны і Берасцейшчыны

САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ




Гомельская Весна
около года назад

Помочь смелым и принципиальным защитникам прав и свобод человека — значит отдать наш долг их

Гомельская вясна
892 participants

Join

Гомельская вясна
@viasnaHomel 556 участников



262 01:55

Пробный период истек, вам необходимо оплатить подписку

Присоединиться к каналу

ПАРТНЁРЫ

Радыё Свабода · Народная Воля · ВЯСНА праваабарончы цэнтр · kamunikat · Наша Ніва · Белорусский документационный центр

Праваабарончыя сайты: Брэст · Віцебск · Гародня · Магілёў

© 2023 Гомельская вясна

stryzhakandrej@gmail.com | sutiajnik@gmail.com